*Дадатак № 2*

# ІНСТРУКЦЫЯ АБ ПАРАДКУ СКАСАВАННЯ ДАМОВЫ

## Працэдура скасавання:

1. Пакупнік мае права скасаваць гэтую Дамову на працягу 14 дзён ад даты атрымання пасылкі без тлумачэння прычын і без які-небудзь выдаткаў, без уліку кошту дастаўкі тавару ў тым выпадку, калі пакупнік выбраў для дастаўкі тавару іншы спосаб дастаўкі, чым звычайны найтаннейшы спосаб дастаўкі, прапанаваны ТАА “Гутэнберг”.
2. У сітуацыі, апісанай у п.1 гэтай Інструкцыі Gutenberg Sp. z o.o. не абавязаны вяртаць Пакупніку сродкі, выдаткаваныя ў сувязі з яго выбарам (вышэй за цану найтаннейшага звычайнага спосабу дастаўкі, прапанаванага ТАА “Гутэнберг”).
3. Час для скасавання дамовы заканчваецца па завяршэнні 14 дня ад дня атрымання пасылкі.
4. З мэтай скасавання Дамовы Пакупнік павінен выслаць на адрас ТАА “Гутэнберг” заяву аб скасаванні Дамовы ў пісьмовай форме. Да заявы аб скасаванні Дамовы трэба далучыць доказ замаўлення, яго копію або прынамсі падаць нумар замовы (гэта дасць нам магчымасць беспамылкова вызначыць замову, аб якой вядзецца), а далей неадкладна вярнуць тавар у непашкоджаным стане на адрас ТАА “Гутэнберг”:

   Gutenberg Sp. z o.o..
   Adres: ul. Lipowa, nr 3D, Kraków, Poland
   Kod pocztowy: 30-702

   з пазнакай 'zwrot', што значыць “вяртанне”

5. Вярнуць тавар трэба не пазней, чым на працягу 14 дзён ад дня, у які Пакупнік заявіў пра скасаванне Дамовы.
6. Для скасавання Дамовы Пакупнік можа выкарыстаць узор заявы скасавання дамовы. Выкарыстанне ўзору сказавання Дамовы, аднак, не абавязковае.
7. Каб выканаць умову 14-дзённага тэрміну, дастаткова выслаць заяву да яго заканчэння.

## Наступствы скасавання Дамовы:

1. Неадкладна па атрыманні ад Пакупніка заявы аб скасаванні Дамовы, ТАА “Гутэнберг” перашле Пакупніку пацвярджэнне атрымання яго заявы ў форме ліста або на ўказаны Пакупніком для такога пацвярджэння адрас e-mail.
2. ТАА “Гутэнберг” неадкладна, не пазней чым праз 14 дзён з дня атрымання ад Пакупніка заявы аб скасаванні Дамовы вяртае Пакупніку ўсе выплаты, у тым ліку цану дастаўкі тавараў, з выключэннем дадатковых выдаткаў, што вынікаюць з выбранага Пакупніком спосабу дастаўкі, адрознага ад найтаннейшага звычайнага спосабу дастаўкі, прапанаванага ТАА “Гутэнберг”.
3. ТАА “Гутэнберг” вяртае выплаты такім самым спосабам, які ўжыў Пакупнік, калі толькі Пакупнік не выкажа выразна згоду на іншы спосаб вяртання, што не прадугледжвае ніякіх выдаткаў для Пакупніка.
4. ТАА “Гутэнберг” пакідае сабе права не вяртаць выплаты, пакуль не атрымае назад тавары або не будзе мець доказ іх вяртання — у залежнасці ад таго, што наступіць раней.
5. Пакупнік нясе адказнасць толькі за зніжэнне кошту прадмета ў выніку яго выкарыстання спосабам, які выходзіць за рамкі таго, што неабходна для ўстанаўлення прыроды, характарыстык і функцыянавання прадмета. Кампакт-дыскі, DVD-дыскі, камп'ютарныя праграмы, захаваныя на носьбітах, неабходна вяртаць у арыгінальнай непашкоджанай упакоўцы (фольга не выдаленая, скрынка без пашкоджанняў). У выпадку парушэння ўпакоўкі кампакт-дыскаў, DVD-дыскаў, камп'ютарных праграм, запісаных на носьбіты (знята фольга, пашкоджана скрынка), права на адмову ад Дамовы ў Пакупніка не застаецца.

Увага: пераклад на беларускую падаем для зручнасці пакупніка. У выпадку спрэчак юрыдычную перавагу мае польская версія.